# ПРАБЛЕМА МЕСЦА І РОЛІ ФІЛАСОФІІ Ў САЦЫЯЛЬНАЙ ДЫНАМІЦЫ: ДЫЯЛЕКТЫЧНЫ ПАДЫХОД ГЕГЕЛЯ І СУЧАСНАСЦЬ

***А. І. Бабко****, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Выпрацаванае Гегелем вырашэнне праблемы месца і ролі філасофіі ў развіцці грамадства істотна паўплывала на яе аналіз у працэсе далейшага разгортвання філасофскага мыслення і зусім не страціла значэнне на сучасным яго этапе. Тэарэтычная рэканструкцыя згаданага вырашэння сутыкаецца, аднак, з шэрагам праблем, якія патрабуюць пільнай увагі дзеля падкрэсленай вышэй рэлевантнасці гэтага феномена і ў гістарычным, і ў актуальным філасофскім кантэксце. Неабходна адзначыць, што цяжкасці ў інтэрпрэтацыі і ацэнцы гегелеўскага бачання сацыяльнай ролі філасофіі выклікаюцца пэўнымі яго аспектамі, якія ствараюць ураджанне непаслядоўнасці мысляра ў плане рэалізацыі дыялектычных прынцыпаў на дадзеным кірунку яго пошукаў. Прыведзеныя ніжэй развагі прысвячаюцца найперш высвятленню пытання, ці адпавядае такое ўражанне сапраўднаму стану спраў.

Гегель вызначае сацыяльны статус філасофіі, яе ролю ў развіцці грамадства ў рэчышчы дыялектычнай метадалогіі, на грунце яе ключавога прынцыпу, прынцыпу тоеснасці супрацьлеглых пачаткаў. Ён перакананы ў непадзельнасці філасофскага мыслення і сацыяльнай рэчаіснасці, у зніта-ванасці філасофіі з іншымі духоўнымі формамі, кожная з якіх выяўляе з той ці іншай ступенню глыбіні ідэальную першападставу грамадскага жыцця.

Рэчаіснае ўвасабленне гэтай першападставы выступае як працэс, яно разгортваецца ў гістарычным часе. Немагчымасць яе імгненнага здзяйснення абумоўлена яе складанай, багатай, канкрэтнай існасцю, якая ўключае ў сябе момант рознасці, супрацьлегласці. Таму відавочна, што для яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэалізацыі неабходна прыкладаць каласальныя намаганні і што дзеля гэтага дух павінен прайсці праз крызісы, канфлікты і калізіі, вытрымаць іх, зрабіўшы адпаведныя супярэчнасці крыніцай свайго самаразвіцця. У выніку напружанай працы, скіраванай на іх пераадоленне, ён узнімаецца да ўсё больш высокіх формаў свайго існавання, і кожная гістарычная эпоха выступае як пэўны этап гэтага руху.

У адпаведнасці з надзвычай высокай ацэнкай духоўнага патэнцыялу філасофіі, які грунтуецца на рэфлексіўнай натуры дадзенай духоўнай формы, Гегель падкрэслівае яе істотную ролю ў згаданым працэсе. З аднаго боку, яна завяршае пэўную эпоху, даводзячы яе прынцып да ідэальнай чысціні, да максімальна абагульненага выяўлення. З іншага боку, аднак, філасофскае мысленне выступае як план, як стратэгія выбудоўвання будучага стану грамадства, бо найвышэйшы пункт у развіцці грамадскага (і, натуральна, не толькі грамадскага) утварэння заўжды непадзельна звязаны з пачаткам заняпаду і псавання, з памкненнем да новай, больш высокай (у выпадку прагрэсіўнага развіцця) формы арганізацыі рэчаіснасці. Нястомная крытычная філасофская думка, якая выяўляе нябачныя для няўзброенага вока, глыбока схаваныя ў пару росквіту заганы, характэрныя для пэўнага спосабу ўладкавання грамадскага жыцця, істотным чынам спрые згаданаму псаванню. А з наступленнем смутнага, крызіснага часу ўвогуле паўстаюць умовы для яе імклівага і магутнага ўздыму, для звядзення канчатковых філасофскіх рахункаў са старым, нежыццяздольным сацыяльным парадкам і стварэння падмурку для новага грамадскага ладу [3, с.70–75].

Такім чынам, згодна з дыялектычнымі гегелеўскімі ўяўленнямі, філасофія належыць свайму часу і разам з тым (у фармальным плане) узвышаецца над ім. Адзінства філасофскага мыслення і сацыяльнага быцця, філасофскай ідэі і гістарычнай эпохі змяшчае ў сабе момант адрознення, процілегласці і таму з'яўляецца жывым і рухомым.

Разам з тым, аднак, у пэўных сваіх творах Гегель выводзіць на пярэдні план момант узаемнай адпаведнасці філа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

софскага мыслення і сацыяльнай рэальнасці. У прадмове да «Філасофіі права» ён падкрэслівае, што наканаванне філасофіі – завяршыць пэўную гістарычную эпоху, і ў сувязі з гэтым абгрунтоўвае марнасць філасофскіх павучанняў адносна належнага ўладкавання грамадскіх спраў: справы ўжо ўладкаваліся, форма арганізацыі грамадскага жыцця ўсталявалася і паспела састрыцца [2, с. 20–21].

Такі падыход тлумачыцца тым, што філосаф убачыў у стане заходняй цывілізацыі, выкліканым да жыцця драматычнымі рэвалюцыйнымі падзеямі канца XVIII ст. і напалеонаўскімі войнамі, у найвышэйшай ступені перспектыўную форму працякання грамадскіх працэсаў. Дадзенае бачанне грунтавалася найперш на палажэнні, згодна з якім у ёй паслядоўна рэалізоўваецца ідэя свабоды. У Гегеля не было ніякіх сумненняў у тым, што арганізаванае такім чынам грамадства ў агляднай гістарычнай перспектыве зможа паспяхова вырашаць істотным чынам уласцівыя яму супярэчнасці, праблемы і канфлікты, зрабіўшы іх крыніцай свайго няўхільнага руху наперад.

Ідэнтычны характар мела і філасофская самасвядомасць Гегеля, які імкнуўся сінтэзаваць у сваёй сістэме найважнейшыя дасягненні папярэдняй філасофскай думкі і спадзяваўся, што атрыманае ў выніку тэарэтычнае ўтварэнне здолее выканаць ролю надзейнай духоўнай падставы для калектыўных і індывідуальных практык рознага кшталту ва ўмовах, створаных рэвалюцыйнымі катаклізмамі ранняга Новага часу.

У сувязі з гэтым «прымірэннем» мыслення і сацыяльнага быцця, дзякуючы якому іх наяўны стан разглядаецца як найвышэйшы і выніковы, паўстае пытанне, ці не здраджвае філосаф дыялектычным прынцыпам у дадзеным сегменце сваіх поглядаў. Як падаецца, прыведзеныя развагі дазваляюць адмоўным чынам адказаць на яго. Сапраўды, грамадства сучаснага тыпу і сучасная філасофская думка, увасобленая ў сістэме абсалютнага ідэалізму, інтэрпрэтуюцца ім як іманентна працэсуальныя, рухомыя феномены, што ні ў якім разе не пярэчыць іх «выніковаму», сінтэтычнаму ха-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рактару (супярэчнасці заўжды вырашаюцца ў яго сістэме праз дынамічны, жывы сінтэз). Разам з тым, аднак, на аснове праведзенага аналізу можна з пэўнасцю сцвярджаць, што ў дадзенай частцы гегелеўскай сістэмы «кансерватыўны» аспект дыялектыкі ў выніку падпарадкоўвае сабе яе «рэвалюцыйны складнік» (ацэнка такога стану спраў ва ўсіх выпадках будзе залежаць ад светапогляду інтэрпрэтатара).

Калі асэнсоўваць дадзены сегмент гегелеўскай філасофіі ў сучасным кантэксце, вынесці канчатковы і адназначны вердыкт адносна ступені яго адпаведнасці патрэбам і рэаліям грамадскага развіцця досыць няпроста. У самым агульным плане цалкам правамерна сцвярджаць, што гісторыя і сучаснасць пацвярджаюць яго слушнасць: заходняя цывілізацыя сапраўды выявіла грунтоўны патэнцыял у плане жыццяздольнасці, крэатыўнасці, паспяховага пераадолення крызісаў, якія яна рэгулярна спараджала і спараджае. Апраўдаўшы яе і яе мадэрны стан, гегелеўская філасофія (у пэўным сэнсе) апраўдала і сябе. (Разам з тым яна была апраўданая і далейшым развіццём філасофскай думкі – як грунтоўна важны духоўны феномен, які ні ў якім разе не можа быць пакінуты па-за ўвагай, хоць нярэдка гэтая ўвага мела характар вострай крытыкі.)

Аднак калі разглядаць распрацаваную Гегелем канцэпцыю гістарычнай дынамікі грамадства і ролі філасофіі ў ёй у іншых ракурсах, яна можа выклікаць і глыбокую нязгоду. Падобны настрой думак паўстае найперш у дачыненні да «ўніфікацыйнага» аспекту дадзенай канцэпцыі, найяскравейшым чынам выяўленага ў тэзе, згодна з якой характар той ці іншай эпохі вызначаецца пэўным прынцыпам, што ажыццяўляецца абраным народам-правадыром [2, с. 432–433] і найбольш адэкватным чынам выяўляецца ў пэўных філасофскіх сістэмах. У выніку альтэрнатыўныя праекты грамадскага развіцця, іншыя народы і створаныя імі філасофскія традыцыі выглядаюць перыферыйнымі, пабочнымі і нязначнымі. (Нельга не заўважыць, што падобныя погляды з'яўляюцца чужымі для беларускай культуры, у якой



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неаднаразова выказвалася глыбокае і прынцыповае непрыняцце ўсякага «месыянізму» – так назваў адпаведную з’яву Ігнат Абдзіраловіч [1, с. 17–18].) Тым не менш і ў гісторыі, і ў сучаснасці можна знайсці важкія аргументы на карысць гегелеўскага падыходу. Так, глабалізацыйныя працэсы, убачаныя і апісаныя як своеасаблівы выхад заходняй цывілізацыі за свае межы, як пашырэнне выпрацаваных ёю прынцыпаў арганізацыі грамадскага жыцця на ўсё чалавецтва, могуць быць вытлумачаныя як пацвярджэнне адпаведных гегелеўскіх высноў. На шчасце, прынцып культурнай разнастайнасці і ў эпоху глабалізацыі не знік з калектыўнай свядомасці чалавецтва і яго творчай дзейнасці. Гэта дазваляе спадзявацца, што яно, прынамсі, у сферы культуры будзе канкрэтнымі справамі абвяргаць «рэдукцыянісцкі» гегелеўскі тэарэтычны праект і іншыя канцэптуальныя пабудовы падобнага кшталту.

Такім чынам, у поглядах Гегеля на месца філасофіі ў сацыяльнай дынаміцы наўрад ці правамерна шукаць непаслядоўнасць з пункту гледжання рэалізацыі дыялектычных прынцыпаў. Калі гэтыя погляды трансфармаваліся, то іх дыялектычны характар не губляўся, а рабіўся іншым (увогуле больш кансерватыўным). Хоць рэалістычны гегелеўскі падыход да праблемы ў асноўным стасуецца з разгортваннем рэальных гістарычных працэсаў, у пэўных выпадках сам гэты факт выклікае пратэст і жаданне змагацца за рэалізацыю альтэрнатыўных шляхоў згаданага разгортвання. Дадзеная акалічнасць з’яўляецца яскравым сведчаннем таго, што філасофія Гегеля зусім не страціла сваёй здольнасці «правакаваць», змушаць да інтэнсіўных духоўных пошукаў, як не страціла яна і свайго станоўчага – светапогляднага і метадалагічнага – значэння.

1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. *Hegel, G. W. F.* Grundlinien der Philosophie des Rechts, oder Naturrecht und Staatswissenschaft im Grundrisse / G. W. F. Hegel. – Hrsg. von Ed. Gans. – Berlin : Duncker und Humblot, 1833. – 440 S.

3. *Hegel, G. W. F.* Vorlesungen über die Geschichte der Philosophie: Erster Teil. / G. W. F. Hegel // Werke: in 20 Bd. / G. W. F. Hegel. – Bd. 18. – Frankfurt am Main: Suhrkamp, 1979. – 568 S.

# ДАРОГАМІ ВАЙНЫ ДА МІРНАГА НЕБА (некаторыя псіхалагічныя і эстэтычныя аспекты ўздзеяння твораў жывапісу і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ў кантэксце новай экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны)

**А. П. Багданаў,** *выкладчык кафедры манументальна-дэкаратыўнана мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасны чалавек лягчэй успрымае не вербальную, а візуальную інфармацыю. Таму наведванне выставак, музеяў робіцца адной з асноўных крыніц інфармацыі, актуальным сродкам выхавання. Новая экспазіцыя Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (музей быў адкрыты 7 лістапада 1944 года, новы будынак прэзентаваны ў 2015 годзе да юбілею Перамогі) разлічана якраз на візуалізацыю фактаў, на візуалізацыю гістарычных падзей. І творы жывапісу, манументальна-дэкаратыўнага мастацтва з'яўляюцца камертонам агульнай канцэпцыі.

У беларускім выяўленчым мастацтве падзеі Другой сусветнай вайны на працягу XX стагоддзя асэнсоўваліся па-рознаму. Спачатку (канец 1940-х – 1950-я) мастакі акцэнтавалі гераізм нашых воінаў, падзеі аднаўляліся ў рэалістычным ключы (напрыклад, «Мінск 3 ліпеня 1944 года» В. Волкава). У 1960–1970-я «суровы стыль» дазволіў раскрыць жахлівую праўду, увесь трагізм ваенных гадоў (дастаткова згадаць серыю жывапісных палотнаў «Лічбы на сэрцы» М. Савіцкага). Папярэдняя экспазіцыя Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны была сфарміравана якраз у гэтых стылістычных рамках. Але з прыходам у мастацтва